# Наш Край

Историко-краеведческая газета Дрогичинского района
№№ 4-5, декабрь 2008 г. Распространяется бесплатно.

***В номере:***

с. 2 ........ Сяргей ГРАНІК
***КІРЫЛА ЦЯРЛЕЦКІ***

с. 2-3 ........ Яўген КВАЧУК
***НА СЦЕЖКАХ ПАЛЕССЯ***

с. 3-4 ........ Галіна ШАФРАН
***ХАВАЮЦЬ ТАЙНЫ САЛДАЦКІХ МАГІЛ***

с. 5 ........ Леонид ЯКУТА
***ЭХО ПОСЛЕДНЕЙ ВОЙНЫ***

с. 6 ........ Сергей Крушина
***СОБЫТИЯ МИНУВШИХ ДНЕЙ***

с. 7 ........ Сергей Граник
***ЧЕХОСЛОВАЦКИЙ КОНФЛИКТ***

с. 8 ........ Сергей Крушина
***АНДРЕЙ БОБОЛЯ***

с. 9 ........ ФОТОВЕРНИСАЖ

с. 10 ........ РЕКЛАМА



*Жемчужина Дрогичинского района – родовая каплица рода Ожешко в д. Закозель.*

◆ Славутыя землякі

# Кірыла Цярлецкі



**Адным з самых славутых нашых землякоў перыяду сярэднявечча з'яўляецца ўраджэнец Піншчыны Кірыла Сямёнавіч Цярлецкі.**

**Год нараджэння яго застаецца невядомы. У энцыклапедыі гісторыі Беларусі ўказана, што памёр ён у траўні 1607 года.**

**Што гэта за чалавек? Які след ён пакінуў у гісторыі Беларусі?**

Я думаю, што імя гэтага чалавека мы павінны ведаць яшчэ і таму, што род Цярлецкіх паходзіць з вёскі Пярковічы, якой да 1756 года гэты род валодаў. Менавіта там доўгі час і знаходзіўся іхні родавы маёнтак.

...Прыязджаеш у Пярковічы. Ідзеш па старадаўняму парку, які быў пасаджаны рукамі епіскапа Кірылы Цярлецкага і быццам дакранаешся да гісторыі. Стаіш сярод векавых ліп і вербаў, і на душы становіцца спакойна і ўрачыста ад таго, што калісьці ў гэтым парку хадзіў у задуменні і мроіў аб будучыні адзін са стваральнікаў царкоўнай уніі. На жаль, унія не захавалася, але цвітуць кожнае лета ліпы, шамаціць лісцем вярба, і дзесьці тут, побач, знаходзіцца прах вялікага рэфарматара сярэдневяковай царквы – Кірылы Цярлецкага...

У пачатку 1570 года Цярлецкі становіцца пратапопам царквы Св. Дзмітрыя ў Пінску. У час міжкаралеўя 1574-75 гг. Радай Вялікага Княства Літоўскага ён прызначаецца епіскапам пінскім і тураўскім.

Па свайму характару Кірыла быў чалавекам сумленным і працавітым. Вельмі добра ведаў жыццё простага народа, якому з самага пачатку сваёй царкоўнай кар'еры і пачаў служыць.

...Час быў вельмі неспакойны. Ішлі бесперапынныя войны то з усходу, то з захаду. У Маскоўскай дзяржаве кіраваў Іван Жахлівы. Еўропу ахапіла Рэфармацыя. Яна была рэальнай пагрозай адзінству не толькі каталіцкай царквы, але і праваслаўнай. Менавіта яна напалохала феадалаў Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства. Нават некаторыя праваслаўныя магнаты федэратыўнай Рэчы Паспалітай пачалі імкнуцца да саюза з каталіцкай царквой, каб папярэдзіць распаўсюджанне гэтага руху, зберагаючы адзінства дзяржавы. Так князь Канстанцін Астрожскі, вядомы ў клерыкальнай гістарыяграфіі як «ревнитель православия», стаў шукаць шляхі да аб'яднання праваслаўнай царквы з каталіцкай, каб выступіць адзіным фронтам супраць рэфарматарскага руху. У чэрвені 1593 года ён пісаў аднаму епіскапу: «Маючы намер адправіцца ў тыя краіны, недалёка ад якіх жыве папа рымскі, прапаную паруліцца пра злучэнне цэркваў». Далей князь К. Астрожскі скардзіцца, што «людзі нашай рэлігіі ўпалі маральна, што пануе ў іх лянота і нядбайнасць», і што яны «разбягаюцца па розных сектах». Дарэчы, шчырым «ревнителем православия» К. Астрожскі стаў толькі пасля таго, як ягоныя ўмовы злучэння цэркваў не былі цалкам прыняты каталіцкай царквой.

Рыму, аднак, удалося не толькі спыніць драбленне каталіцкай царквы, але і перайсці ў наступ на пратэстантызм: пачалася Контррэфармацыя. Адным з элементаў правядзення яе ў жыццё, на мой погляд, было адраджэнне ідэі Фларэнтыйскай уніі, якая згуртавала вакол Рыма разам з католікамі і праваслаўных, і тым самым умацоўвала пазіцыі каталіцкай царквы.

...Кірыла Цярлецкі ў гэтых умовах прыклаў шмат намаганняў для ўмацавання эканамічнага стану сваёй епархіі. За 10 год кіравання царквой на Піншчыне яму ўдалося пабудаваць шмат цэркваў і манастыроў. Епархія стала адной з самых моцных і ўплывовых у краіне.

У 1585 г. кароль Рэчы Паспалітай прызначае К. Цярлецкага епіскапам луцкім і астрожскім. Гэта было адным з самых вялікіх царкоўных уладанняў таго часу. Гэтая епархія мела больш за 40 царкоўных маёнткаў. Тут Цярлецкаму зноў прыйшлося займацца павялічэннем царкоўных даходаў і вяртаннем царкоўнай маёмасці.

У час вяртання з Масквы канстанцінопальскага патрыярха Іераміі ў 1589 г. Кірыла атрымаў ад яго ганаровы сан патрыяршага экзарха, што было ўпершыню ў Рэчы Паспалітай. Такой пашаны не атрымліваў ніводны рускі епіскап. Гэтая пасада давала ўладу не толькі над астатнімі епіскапамі, але і над кіеўскім мітрапалітам. Сам патрыярх прызначыў Цярлецкага сваім намеснікам па прызначэнню епіскапаў.

Ініцыятарамі Брэсцкай царкоўнай уніі былі вярхі праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай, асабліва незадаволеныя дзеяннямі канстанцінопальскага патрыярха Іераміі, які ў 1589 г. абвясціў аб стварэнні ў Маскве патрыярхіі. Праект уніі прапанавалі і прынялі мітрапаліт кіеўскі, галіцкі і ўсяе Русі М. Рагоза, епіскап уладзімірскі і брэсцкі І. Пацей, патрыяршы экзарх, епіскап луцкі і астрожскі К. Цярлецкі, епіскап тураўскі і пінскі Л. Пялчыцкі і іншыя. У чэрвені 1591 года на саборы ў Брэсце амаль усе епіскапы Рэчы Паспалітай падпісалі грамату аб намеры заключыць унію з каталіцкай царквой на пэўных умовах. Пачаліся доўгія перамовы паміж епіскапамі, папскім нунцыем і каралём Рэчы Паспалітай. Толькі ў 1595 годзе ўдзельнікамі былі выпрацаваны «Артыкулы» ўмоў уніі. Нарэшце ўсе бакі прыйшлі да згоды.

У лістападзе-лютым 1595-96 гг. К. Цярлецкі і І. Пацей знаходзіліся ў Рыме, дзе ўмовы уніі былі зацверджаны рымскім папам Клімента VIII. Вярнуўшыся з Ватыкану, Цярлецкі збірае царкоўны сабор. З 6 па 10 кастрычніка 1596 года ў Брэсце на гэтым саборы былі канчаткова зацверджаны палажэнні уніі. Кароль Жыгімонт Ваза універсалам ад 15.12.1596 года зацвердзіў акт Брэсцкай уніі і заклікаў беларусаў і ўкраінцаў прызнаць уніяцкіх епіскапаў. З цягам часу унію прыняла значная частка праваслаўнага насельніцтва, але яшчэ доўга працягваліся рэлігійныя міжусобіцы ў Слуцкім княстве, наваколлях Магілёва і Пінска.

Што простаму люду дала унія? На гэтае пытанне красамоўны адказ даў адзін з працаўнікаў уніяцтва мітрапаліт І. Сямашка. Ён пісаў у сваіх «Запісках»: «Ва ўмовах, калі пануючы клас успрыняў польскую культуру і мову, уніяцкая царква становіцца галоўнай і адзінай захавальніцай народнай мовы і культуры... Увесь «грэка-уніяцкі» народ і гаворыць на беларускай ці маларасійскай мовах, дзеці уніяцкага духавенства выключна чуюць толькі гэтую мову».

Уніяцкая царква на Беларусі праіснавала да 1839 года – 243 гады. За гэты час яна перажыла шмат зменаў і стала сапраўды народнай верай.

Пасля смерці ў траўні 1607 года славуты наш зямляк Кірыла Цярлецкі быў пахаваны на сваёй радзіме ў в. Пярковічы, ва уніяцкай царкве, якая знаходзілася на месцы, дзе стаіць сённяшні храм. Мабыць і зараз менавіта там дзесьці замураваны мошчы уніяцкага епіскапа луцкага і астрожскага Кірылы Цярлецкага. Гэтаму сведчаць успаміны аднаго з нашчадкаў роду Віславухаў – Францішка Віславуха. У сваіх успамінах ён пісаў, што бачыў у падзямеллі вялікую чорную гранітную пліту з надпісам на латыні. Побач былі пахаваны ягоныя продкі Зянон і Віктар Віславухі.

Мінула больш за 400 гадоў з тых далёкіх часоў. Змянілася не адно пакаленне людзей, але памяць аб нашым славутым земляку Кірылу Цярлецкім жыве.

**Сяргей ГРАНІК**

◆ Гісторыя

# «На сцежках Палесся»

**Так называецца кніга Францішка Віславуха, у якой па-мастацку апісаны мясціны ад Брэста да Лунінца. Аўтар кнігі нарадзіўся ў канцы пазамінулага стагоддзя, таму даносіць да нас бачанае ў пачатку XX ст. і да 1939 г. «На сцежках Палесся» выдадзена ў Лондане ў 1976 г. на польскай мове. У нас гэта выданне з'яўляецца бібліяграфічнай рэдкасцю.**

**Па жанру – гэта настальгічныя ўспаміны нашага земляка, які апынуўся на Захадзе. Застаўся далёка ад свайго роднага дома, што ў вёсцы Пярковічы (за дзесяць кіламетраў ад Драгічына). Кніга складаецца з 24-х нарысаў: «Прыбужжа», «Могілкі», «Нашы яўрэі», «Гармата», «Выдры» і іншыя. Шмат старонак займаюць хвалюючыя апісанні прыроды, бо Ф. Віславух вельмі шанаваў паляванне. Аўтар з павагай піша пра мясцовых жыхароў, пра традыцыі, звычаі і тыповыя рысы жыцця на Палессі.**



### Жывы агонь

Паляшук любіць свой гаспадарчы загон, які патрабуе дбаць пра кожны каласок жыта. Панічна баіцца, каб нехта не зачараваў палі праз звязванне некалькіх каласкоў разам. Вялікая пашана да ўласнага хлеба, вырашчанага на ўласнай зямлі. Калі госці ад'язджалі, гаспадыня давала на дарогу кавалак хлеба.

Паляшук сам сабе будуе хату, ставіць печ, сам тчэ сукно і палатно з уласнага льну ці воўны. Гаспадарчыя прылады былі таксама сваёй работы. Не было найлепшых кавалёў і шаўцоў, чым у Давыд-Гарадку. У Польшчы насілі тыя боты найбагацейшыя людзі. «Нават у Парыжы ў мяне выпытвалі, скуль маю такія добрыя боты, а былі з Палесся».

Жывы агонь быў у доме пастаянна, не тушылі яго і на ноч. Абраза хатняга агню належала да найцяжэйшых абраз. Плявок у агонь мог прывесці да забойства чалавека. На стале заўсёды хлеб у льняной хустцы і агонь у печы былі сімваламі бяспекі і святасці. Калі прыходзіў госць, у агонь клалі бярозавае палена, бо яно дае яснае полымя.

### Ідучы кладкамі

«Найбольшае здзіўленне ў чужых выклікалі нашы кладкі». То папросту дошка, што ляжыць папярок рова і замяняе масток. Але ў некаторых мясцінах Палесся кладкамі праходзілі вялікую адлегласць. Аднойчы сам ішоў з Пудзіч да Гаўрылыч кладкай, якая мела каля 18 кіламетраў. Ішоў з калоды на калоду, падпіраўся па патрэбе тычкай. На пачатку кладкі і на яе канцы заўсёды ляжалі некалькі тычак, пакінутых папярэднікамі. Летам ісці кладкай зручна, калі не лічыць хмары камароў над галавой. Горш было восенню пры першых маразах, кладкі рабіліся слізкімі, абледзянелымі. Для палешукоў кладкі не былі перашкодай, спрытна па іх хадзілі. Раз ішоў з правадніком, і ён пахваліўся другому палешуку: «Добра ходзіць па кладках, сабака!»

Палеская вёска аддалена балотамі ад мястэчак, жыве сваім жыццём. Самакіраванне існавала тут заўсёды і належыць да няпісанага права краю. Спрэчкі паміж жыхарамі вырашаюцца на месцы. Падпал хаты крыўдзіцеля тут звыклая рэч, але стадолы і стайні не паляць. Забойства не сустракаліся. Прырода краю, бездарожжа, адлегласць, звычаі складаліся на то, што самакіраўніцтва само вырашала справы. Ніколі тут не палілі стагоў сена, каб не крыўдзіць жывёлы. То прыгожы маральны звычай.

На Палессі існуе даўняя спрэчка аб прыналежнасці лесу. Для палешука лес – «божы», не належыць нікому, бо ніхто яго не сеяў. Лес тут ёсць вечна, належыць усім. Так было заўсёды. Уласнік лесу быў першым ворагам палешука. Другім ворагам было балота, бо яго вакол шмат і яно не надаецца ні да якой гаспадарчай патрэбы. Вострая трава не магла быць кормам, толькі валы маглі яе есці. Палешукі баяліся багны і па захадзе сонца ніколі не выходзілі да балота. Лічылася, што там жывуць злыя духі. Існаваў праклён: «Каб ты скрозь зямлю пайшоў».

### Забабоны палешукоў

Кожны іх крок, кожны ўчынак падпарадкаваны нейкай вышэйшай сіле, на якую, па іх разуменню, яны не маюць ніякага ўплыву. Людзі жывуць як бы пад маральным тэрорам, якога не могуць сабе патлумачыць. У паляўнічых нельга пытаць аб выніках стрэлу, бо яны вераць, калі здрадзіш таямніцу свайго стрэлу, дык другога трапнага стрэлу не будзе. Збіраючыся ў лес, нельга гаварыць куды, калі і галоўнае, па што ідзеш. Вельмі шануюць агонь, лічаць «святым». Пажар, учынены маланкай, не тушаць, толькі не даюць распаўсюдзіцца. Пустыя вёдры ў руках бабы прыносяць няўдачу, але поўныя у руках дзяўчыны – поспех. Сустракаючы дзяўчыну, якая нясе ваду са студні, трэба папрасіць, каб пляснула трохі вады на зямлю – на шчасце. За гэта яе дзякавалі пацалункам. «Мілы гэта быў звычай і належыць да радасных успамінаў маладосці».

У розных мясцовасцях сустракаліся людзі, якім прыпісвалася чароўная сіла. Здаралася, паляўнічы заходзіў да добрай чараўніцы папрасіць удачы, а вяртаючыся з лесу, прыносіў ёй штосьці з упаляванага. Горш было са злымі чараўніцамі, іх дамы абыходзілі здалёк. Паляўнічыя хавалі сваю зброю ад вока чараўніка. Млынары на вадзяных млынах лічыліся, калі не чараўнікамі, дык прыяцелямі чараўнікоў, таму з млынарамі ніколі не сварыліся. Нельга было браць ваўчаня з логава, бо ваўчыца нашле ваўкоў на вёску, будзе помсціць. Паляўнічы нават нікому не казаў, дзе бачыў логава ваўчыцы.

Жыхары Палесся вынайшлі свае праклёны, якія чужыя не зразумеюць, бо апіраюцца яны на бытаванне тутэйшых умоў жыцця. Такі праклён, як «каб да дому не трапіў», пагражае толькі таму, хто заблукаў у пушчы ці балоце. Праклён «каб на лодцы заламаў» для тых, хто зімовай парой перапраўляецца лодкай праз кепска замерзлую раку, «каб цябе балота ўцягнула» – гэта страшная павольная смерць у дрыгве. «Каб цябе воўк разарваў» – гэта небяспека ў пушчы.

Паляшук, на пытанне аб адлегласці, да якой вёскі, часта адкажа, што столькі і столькі «клікаў». Гэта значыць чутнасць голасу: да той вёскі трэба столькі разоў змяніць месца, каб быць пачутым.

### Мястэчкі

У больш найлюдней частцы Палесся ўздоўж тракту Брэст – Лунінец мястэчкі ляжалі на адлегласці каля 20 км адно ад другога. Значную частку насельніцтва мястэчка складалі яўрэі. Гэта былі рамеснікі, купцы, агароднікі, вазніцы і розныя іншыя майстры. Ніхто ніколі не скардзіўся, што яго ў яўрэйскай краме ашукалі ці пакрыўдзілі. Яўрэйскія купцы лічыліся лепшымі за іншых. Пра іх сумленнасць і вернасць дадзенаму слову хадзілі гісторыі. Сяляне не мелі наяўных грошай, нават заможныя мужыкі не мелі дома хоць 12 злотых. Вясковец, ідучы ў краму, браў з сабою харчы: яйкі, масла, лён, палатно ці збожжа. Выменьваў у краме на соль, цвікі, іншыя неабходныя рэчы і ніколі не было скаргаў на крыўду ад яўрэя-купца. Усе былі задаволеныя цаной. «Гэта колькі ж трэба гадоў такога ўзаемнага гандлю, каб умацаваць такую ўзаемную павагу?»

### Цыганы

Мястэчкі злучаліся трактамі, добра прыстасаванымі да язды коньмі. Ля трактаў кожны вандроўнік мог застацца на адпачынак. Толькі цыганы не маглі прыпыняцца больш як на 24 гадзіны, потым мусілі ехаць далей. Ля трактаў стаялі корчмы: вялікія драўляныя будынкі з пакойчыкамі для падарожных, хатай для простых людзей, стайняй. Калі запрацавала чыгунка, корчмы пачалі знікаць. Цыганы не мелі права карыстацца карчмою. Яны былі важным элементам палескага краю. Цыганы выконвалі працу, на якую іх чакалі ў вёсках. Яны рабілі кухоннае начынне, медзяныя катлы, кавалі коней, выпраўлялі вазы і колы, майстравалі збрую. Некаторыя ўладальнікі маёнткаў дазвалялі цыганам стаяць табарам на сваёй зямлі даволі доўга. Тады ўладальнік зямлі нёс поўную адказнасць за шкоду ў аколіцы з-за цыганоў. То былі крадзяжы коней, таму па прыездзе табару коней цыганскіх падлічвалі. Уладальнікі маёнткаў давалі цыганам бясплатна бульбу, кашу, тлушч, малако. Цыганы ў малацэ для дзяцей мелі асабістую патрэбу, бо не вадзілі за сабой кароў. Цыганкі насілі чырвоныя спадніцы, жоўтыя хусткі, шмат караляў, бранзалетак і пярсцёнкаў. Гэтае ўбранне кантраставала на шэрым адзенні мясцовых жыхароў. Цыганкі варажылі, а моладзь мышкавала па ваколіцах, дзе часта знікала з плоту якая вопратка. Але мясцовыя жыхары яўна варожа да цыган не ставіліся, толькі пільна сачылі за сваёй маёмасцю. Выстаўлялі варту, каб пільнаваць вёску ад крадзяжу з боку цыган. Але бывала самі вяскоўцы спісвалі на цыган свой грэх.

**Яўген КВАЧУК**

# Хаваюць тайны салдацкія магілы

Памяць ◆

***90 гадоў царскія ўзнагароды праляжалі ў кургане ля вёскі Заверша***

**У сакавіку 1995 года на Беларусі быў створаны спецыялізаваны вайсковы пошукавы батальён, які займаецца вывучэннем месцаў былых баёў і пошукавымі работамі як у архівах музеяў, так і археалагічнымі раскопкамі (ў вайсковым штаце батальёна працуюць і прафесійныя археолагі). За гэты час падраздзяленнямі батальёна на тэрыторыі Беларусі адпрацаваны 728 пошукавых аб'ектаў, знойдзена 12580 парэшткаў былых воінаў (з іх 2817 загінулі ў часы Першай сусветнай вайны, 9432 – у гады Вялікай Айчыннай), перапахавана 10368 былых салдат, выяўлены і вернуты гісторыі і блізкім 47200 невядомых імёнаў. У час раскопак вайскоўцамі батальёна выяўлена і знішчана 2685 выбухова-небяспечных прадметаў, 88 адзінак стралковай зброі, 4360 патронаў, знойдзена 85 медальёнаў, 865 жэтонаў, 18 узнагародаў...**

Не так даўно пералік знаходак пошукавага батальёна папоўніўся каштоўнымі экспанатамі, якія былі раскапаны непадалёку ад вёскі Заверша.

Як патлумачыў Міхаіл Барысавіч Крыцкі, начальнік аддзялення тэрытарыяльнай абароны райваенкамата, пошукавым работам на тэрыторыі раёна папярэднічала складанне інфармацыйных лістоў, па якіх і вяліся пазней раскопкі. Іх складалі мясцовыя краязнаўцы і спецыялісты – дырэктар музея партызанскай славы С. У. Гранік, архівіст В. А. Мелехавец і іншыя. Для археалагічнага даследавання вайскоўцам было прапанавана 7 аб'ектаў у розных кутках Драгічынскага раёна, дзе, па меркаванню краязнаўцаў, маглі быць не ўлічаныя вайсковыя магілы. Але самым дакладным і выніковым аказаўся інфармацыйны ліст аб салдацкіх пахаваннях Першай сусветнай вайны ля вёскі Заверша.

Месцам раскопак было ўзвышша за вёскай,




*Георгіеўскі крыж 4-й ступені з нумарным знакам 101967.*




*Медаль «За храбрасць» з нумарным знакам 117775.*

як расказаў археолаг вайсковага падраздзялення Андрэй Юр'евіч Каркотка. Сапёры перакідалі нямала зямлі, пакуль дайшлі да пахавання. Спачатку былі знойдзены касцявыя парэшткі чалавека. А следам – і даволі значныя па тым часе ўзнагароды: Георгіеўскі крыж 4-й ступені з нумарным знакам 101967 і медаль «За храбрасць» з нумарным знакам 117775. Яны, па меркаванню археолага, належылі аднаму і таму ж чалавеку, так як трымаліся на адной планцы для узнагарод, фрагменты якой таксама ўцалелі.

Цяпер, як паведаміў А. Ю. Каркотка, матэрыялы іх экспедыцыі будуць накіраваны ў архівы і па нумарах узнагарод пастараюцца выявіць імя чалавека, які ваяваў і загінуў у гэтых мясцінах і які, верагодней усяго, яшчэ з Першай сусветнай вайны лічыўся без вестак знікшым. І, хутчэй за ўсё, гісторыі будзе вернута ягонае імя, а родным – магіла.

Паколькі ў Завершы калісьці была праведзена актыўная краязнаўчая работа, то захаваліся ўспаміны былых відавочцаў аб падзеях, якія адбываліся ў гэтых мясцінах. У прыватнасці, Дзмітрый Іванавіч Радэня (цяпер ужо нябожчык) у свой час прыгадваў: «Было гэта ў 1915 годзе. Да нас немцы ўвайшлі з боку Крамна. А зусім недалёка, у мікіцкіх лясах, стаялі расійскія салдаты. Бой, які завязаўся між імі, быў цяжкім: супрацьстаянне працягвалася некалькі сутак. У выніку бою згарэў Мікіцк і частка вёскі Заверша. І ўсё ж рускія адступілі, а немцы яшчэ доўга ўладарылі ў гэтых мясцінах».

Пасля таго бою немцы падабралі забітых: і сваіх, і рускіх. За Завершам яны штабелем склалі расійскіх воінаў, а па баках паклалі загінуўшых нямецкіх салдат. Затым насыпалі курган, абкапалі яго ровам і паставілі крыж. Гэта месца да сённяшняга часу называюць Нямецкая гара. Праўда, парэшткаў немцаў у той магіле не засталося. Гадоў праз 20 пасля таго бою ў вёску прыехалі іх суайчыннікі, якія з дапамогай тутэйшых людзей раскапалі курган, дасталі адтуль сваіх воінаў і перавезлі іх на нямецкія могілкі ў вёску Сіманавічы. А рускія заставаліся ляжаць пад курганам»...

Гэта пацвердзілася і ў час нядаўняй пошукавай экспедыцыі: акрамя царскіх узнагарод – Георгіеўскага крыжа і медалі «За храбрасць», якімі адзначаліся заслугі асабліва храбрых і адважных расійскіх салдат, тут былі знойдзены парэшткі некалькіх чалавек, біклага, медальёны, фрагмент патранташу з патронамі, іншыя рэчы.

Боепрыпасы – самыя небяспечныя са знаходак у час такіх раскопак і ў руках самазваных, ці, як іх яшчэ называюць, «чорных» капальнікаў, нярэдка прыводзяць да трагедыі. Невыпадкова з дзяржаўнага боку пошукавыя работы даручана весці прафесіянальным вайскоўцам і археолагам.

Поспех экспедыцыі раскопак бліз вёскі Заверша ў значнай меры забяспечылі: старэйшы лейтэнант Юрый Белавусаў, малодшы сяржант Мікалай Ляўковіч, радавы Аляксандр Дубоўскі... Менавіта яны і іх калегі з пошукавага батальёна ў супрацоўніцтве з неабыякавымі мясцовымі краязнаўцамі сёння імкнуцца адшукаць не ўлічаныя магілы і пахаванні, якія пакінулі на нашай зямлі войны, а таксама выявіць дагэтуль невядомыя імёны салдат, якія там спачываюць. Бо людзі жывыя да тае пары, пакуль мы пра іх памятаем...

**Галіна ШАФРАН («Драгічынскі веснік»)**

◆ **Документ**

## ФЕДЕРАЛЬНОЕ АРХИВНОЕ АГЕНТСТВО РОССИЙСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВОЕННО-ИСТОРИЧЕСКИЙ АРХИВ (РГВИА)

На Ваш запрос сообщаем, что Георгиевским крестом 4-й степени № 101967 был награждён рядовой 14-й роты 196-го пехотного Инсарского полка Василий Брезгин. Об этом было объявлено в приказе по полку № 328 от 14.12.1914 г. Приказ был составлен в м. Дембовицы. 196-й пехотный Инсарский полк входил в состав 49-й пехотой дивизии 24-го армейского корпуса (ф. 2810, оп. 1, д. 101).

Другие сведения о В. Брезгине, а также о кавалере Георгиевской медали 4-й степени № 117775 не обнаружены.



Память ◆

# Эхо последней войны

**Шестьдесят лет назад триумфальной Победой советского народа закончилась Великая Отечественная война. Больше полувека прошло с тех пор, но до сих пор живут среди нас участники этой войны, которых с каждым годом становится всё меньше и меньше. Но в каждом из них живёт память об этой войне. И не может быть иначе. Очень большая территория была охвачена этой войной, очень много жизней она унесла.**

Несмотря на десятки миллионов погибших, дорога память о каждом человеке, отдавшем свою жизнь за Родину. Шестьдесят лет, вместивших в себя грандиозные события, отделяют нас от Великой Отечественной войны, но не поблекли, не стёрлись в памяти, не позабылись эти четыре героических года. Война продолжает жить в нас, в наших воспоминаниях, в судьбах людей, в книгах и обелисках, во всём, к чему прикоснулась она, где оставила свой след. И для тех, кто был на фронте, и кто родился уже после того, как отгремели бои, военное прошлое – пора величайших испытаний, невероятного драматизма и беспримерного героизма. Великое не должно быть забыто. Потому так ценно каждое новое воспоминание, каждая волнующая история, внесённая в рассказы о Великой Отечественной войне её бойцами.

Огромна была эта война, и всё написанное о войне не может восстановить полностью картину грозных 1941-45 годов. Бойцы границы первыми отразили напор фашистских завоевателей. Они первыми оказались под обстрелами танковых и моторизованных полчищ врага. Раньше всех они вступились за честь, свободу и независимость своей Родины.

Воины Советской Армии героически сражались в приграничных боях, стойко дрались с ненавистными захватчиками под Минском и Ленинградом, у Киева и Одессы, под Москвой, Сталинградом и Курском, в Заполярье и Крыму. Великая освободительная миссия Советской Армии в Польше, Венгрии, Румынии, Чехословакии была с воодушевлением воспринята народами этих стран.

В годы Великой Отечественной войны вместе с воинами Советской Армии мужественную борьбу против немецко-фашистских оккупантов вели партизаны. Именно благодаря партизанам враг не чувствовал себя хозяином на захваченных территориях. В Беларуси нет ни одной семьи, которую не задела бы своим чёрным крылом война. А потому, практически, не было в области ни одного крупного населённого пункта, где не были бы созданы подпольные группы, не было района, в котором не действовал бы партизанский отряд. Есть люди, о которых говорят: всю жизнь прожил в борьбе, в борьбе за счастье людей. Эти слова относятся и к нашему земляку – Деренчуку Виктору Митрофановичу. Куда только не бросала его судьба. Не один раз жизнь Виктора Митрофановича была на волоске от смерти. Но железная выдержка, сила воли и решительность всегда выручали его. Родился Деренчук в 1922 году в деревне Закозель.

В 1939 г., когда Западная Белоруссия была воссоединена с БССР, появилась возможность получить образование. Виктор Митрофанович, как и многие его товарищи, в поисках образования отправляется в город Минск. Там он учится в Минском сельскохозяйственном училище. Но начавшаяся Великая Отечественная война не даёт возможности получить образование. Виктор Митрофанович возвращается домой. Но уже в апреле 1942 г. он вступает в партизанский отряд имени Шиша, чтобы громить врага и защищать Родину. По воспоминаниям Виктора Митрофановича, это был очень тяжёлый период в его жизни: постоянная борьба с врагом, засады, нападения на немецкие гарнизоны, минирование железных дорог. Тяжело приходилось переживать гибель боевых товарищей. В марте 1944 года Деренчук с группой партизан отправляется за линию фронта, в город Дубровицу. После непродолжительной учёбы и подготовки Виктор Митрофанович получает воинскую специальность – разведчик и зачисляется в регулярную армию. И вот в составе 61-й армии Деренчук принимает участие в освобождении своей Родины – Беларуси. Первым городом, который пришлось освобождать, был город Столин. По воспоминаниям ветерана, это был настоящий ад. Борьба шла буквально за каждый метр, было очень много убитых и раненых. Следующим городом, который освобождала 61-я армия, был город Пинск. 16 июля 1944 года Виктор Митрофанович со своей частью вступает на территорию Дрогичинского района. Первой деревней, которую освободили бойцы от немецко-фашистских захватчиков, была деревня Ровины. После освобождения Ровин, Виктор Митрофанович принимает участие в освобождении других деревень Дрогичинского района. Затем часть, в которой служил Деренчук, отправляют на территорию Прибалтики, где Виктор Митрофанович принимает участие в боевых действиях.




В одном из боевых эпизодов ему пришлось выручать боевого товарища, по вине которого артиллерийское орудие было захвачено немцами. Узнав, что орудие захвачено врагами, Виктор Митрофанович вместе с разведчиками принимает очень рискованное решение. Они пробираются в тыл врага и в ходе ожесточённого ночного боя отбивают артиллерийское орудие. За этот бой Виктор Митрофанович был награждён медалью «За отвагу».

По признанию ветерана, несмотря на то, что он награждён орденом Великой Отечественной войны и многими другими медалями, медаль «За отвагу» является для его более ценной, как воспоминание о том бое, где, рискуя своей жизнью, он выручил товарища и выполнил свой воинский долг. Незадолго до окончания войны Виктор Митрофанович был тяжело ранен.

Несмотря на профессионализм врачей, которые сделали всё, чтобы сохранить ему руку, Виктор Митрофанович остался инвалидом II группы. После войны Деренчук также не остаётся в стороне от трудовой и общественной деятельности. Долгое время Виктор Митрофанович работал в торговле. Принимал участие в работе родительского комитета Хомской СШ, где был председателем. В 1970 году Деренчук заочно оканчивает среднюю школу, которую в своё время не дала закончить война. Также Виктор Митрофанович воспитал достойную смену. Дочь Галина долгое время работала медсестрой, сейчас она на пенсии. Сын, Деренчук Василий Викторович, в настоящее время работает генеральным директором СП «БелКельме». Навестив с друзьями ветерана Великой Отечественной войны, у меня осталось очень восторженное чувство.

